*Валянціна ВАХІТАВА*

## Мяцеліца

За акном мяцеліца
Белым пухам сцелецца,
Кружыцца, лятае,
Сняжком пасыпае.
Праляцела па-над дахам
І над полем белым птахам,
Разаслалась на дарозе,
Заблытала ў бярозе.
Раптам сціхла,
Дзесь прапала.
На хвілінку ціха стала.
Мо, схавалася ў стозе?
Не, прысела на парозе,
Адпачыла, пасядзела,
Узнялась, зноў паляцела,
Закружыла ў віхры.
Была тут, ужо ў бары.
З вечара ажно да ранку
Працавала без прыстанку:
Намяла снегу сумёты,
Завалiла двор, вароты.
Каб на вуліцу прабрацца,
Трэба за рыдлёўкі брацца,
Расчышчаць усе дарогі,
Каб не грузлі ў снезе ногі.